# НАЗОЎНІК ЯК ЧАСЦІНА МОВЫ (БЕЛАРУСКАЯ МОВА, 6 КЛАС)

**Машканава Святлана Аляксандраўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА “Суражская сярэдняя школа імя Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова”

***Родная мова — крыніца ведаў і натхнення!***

*Дадзены ўрок з’яўляецца першым пры вывучэнні самастойнай часціны мовы “Назоўнік”. На ім вучні сістэматызуюць атрыманыя веды па тэме з пачатковай школы і 5 класа. Падабраныя заданні спрыяюць паўтарэнню тэарэтычнага матэрыялу і прымяненню практычных навыкаў па тэме.*

**Тэма:** Назоўнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма.

**Мэта:** да канца ўрока вучні засвояць назоўнік як часціну мовы.

Задачы:

» пашырыць веды вучняў пра агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы назоўніка, сінтаксічную ролю;

» садзейнічаць выпрацоўцы навыкаў знаходзіць назоўнікі ў сказах, вызначаць іх сінтаксічную ролю;

» спрыяць выхаванню павагі да сваёй краіны.

**Эпіграф:**

*Што гэта за краіна такая?*
*Імя ўсё навокал тут мае:*
*Рачулка, расінка і зорка,*
*Пчала, аблачынка, вавёрка,*
*Дажджынка, сунічка, буслянка,*
*Бярозка, узгорак, палянка.*
*Па гэтай краіне нямала*
*З настаўніцай вы вандравалі.*
*Вы хуценька ўсё ўспамінайце*
*І назву яе адгадайце.*

**Этапы ўрока:**

**1. Арганізацыйна — матывацыйны**

На дошцы напісаны словы:

Будзем ведаць…

Будзем умець…

**2. Актуалізацыя раней вывучанага**

***1. Выкананне лічбавага дыктанта.***

1. У беларускай мове ўсе словы падзяляюцца на разрады, якія называюцца часцінамі мовы. (1)

2. Усе часціны мовы падзяляюцца на самастойныя і службовыя. (1)

3. Назоўнік — гэта службовая часціна мовы. (0)

4. Назоўнік абазначае прадмет і адказвае на пытанні хто? што? (1)

5. Назоўнікі адносяцца да мужчынскага, жаночага або ніякага роду, змяняюцца па ліках і склонах. (1)

6. Назоўнікі могуць выконваць у сказе толькі ролю дзейніка. (0)

7. Пачатковай формай назоўніка з’яўляецца форма назоўнага склону адзіночнага ліку. (1)

8. Словы прырода, Беларусь, краіна — гэта назоўнікі. (1)

9. Словы непаўторная, незалежная, гасцінная — гэта назоўнікі. (0)

***2. Устаўце прапушчаныя літары. Падкрэсліце назоўнікі.***

Музыка прыроды
Як зачару..ць птушак галасы,
У душ.. зусім не застаецца прозы,
Прыемна луг а..ведаць і лясы,
Паслухаць ш..пт травы і плач бярозы.
Там музыка прыродн..ая гучыць
І асалодай сэ..ца напаўняе,
Душы цудоўна: слуха.., маўчыць
Або ў такт чароўна па..пявае.
А. Балуценка

***3. Пастаўце назоўнікі ў пачатковую форму.***

у душы —
прозы —
бярозы —
сэрцы —
травы —
галасы —

***4. Падкрэсліце назоўнікі як члены сказа.***

1) Продкі беларусаў займаліся земляробствам і пчалярствам.

2) Спадчына — гэта народныя звычаі і культура, якія складваліся стагоддзямі ў беларускім народзе і якія засталіся нам.

3) Пад парывамі вятроў у чаканні першага снегу трывожна гудуць сосны.

***5. Складзіце сінквейн да слова Беларусь.***

Беларусь

незалежная, прыгожая

квітнее, прыгажэе, развіваецца

Наша Беларусь з кожным годам становіцца прыгажэйшай. (Беларусь — наша Радзіма)

Радзіма

**3. Дынамічная паўза**

Вучні выходзяць да дошкі і размяркоўваюць словы ў слупкі “Назоўнікі”, “Прыметнікі”, “Дзеясловы”.

Радзіма, Айчына, Беларусь, незалежная, непаўторная, развіваецца, клапоціцца, не ваюе, абаранялася, героі, гасцінная, прымае, традыцыі, пакаленне, ветэраны, Бацькаўшчына.

**4. Кантрольна-рэфлексійны.**

Выкананне бліц-тэстаў.

1. Знайдзіце назоўнік у радку слоў.
   А) прыгожы Б) добры В) Радзіма
2. Знайдзіце назоўнік мужчынскага роду.
   А) падручнік Б) сястра В) парта
3. Знайдзіце назоўнік жаночага роду.
   А) брат Б) стол В) песня
4. Знайдзіце назоўнік ніякага роду.
   А) дзіця Б) крэйда В) стул
5. Знайдзіце назоўнік агульнага роду.
   А) непаседа Б) бабуля В) дзядуля
6. Вызначце назоўнік, які мае форму толькі адзіночнага ліку.
   А) год Б) поўдзень В) вучань
7. Вызначце назоўнік, які мае форму толькі множнага ліку.
   А) браты Б) берагі В) канікулы
8. Вызначце нескланяльны назоўнік.
   А) таксі Б) станцыя В) аповесць
9. Вызначце слова з памылкай ў напісанні.
   А) касец Б) дзет В) суддзя

**5. Выстаўленне адзнак.**

Я сабе паставіла б (паставіў бы) адзнаку .., таму што …

**6. Дамашняе заданне.**

Параграф 23, пр. 161

9–10 балаў: скласці невялікае паведамленне на тэму “Мая родная Беларусь”.